М.Я.Сямєнчык

## ЛЮТАУСКАЯ (1917 г.) РЭВАЛЮЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ

27 лютага 1917 г. у выніку паустання рабочых і салдат Петраграда царскія міністры поунасцю страцілі кантроль нд сітуацыяй і вымушаны былі ратавацца ад народнага гневу. Улада перайшла ў рукі Часовага камітэта Дзяржаўнай думы на чале з М.Радзянкам. Намаганнямі камітэта і Выканкома Петрасавета распачалася праца па фарміраванню новага ўрада.

Між тым. сапраўдная сутнасць падзей у сталіцы не хутка была спасцігнута грамадскасцю беларускіх губерняу з прычыны абмежаваных, супярэчлівых, скажоных паведамленняу, што траплялі сюды. Да таго ж карэннае насельніцтва, бежанцы, служачыя устаноў па абслугоуванню фронту - камітэтаў Усерасійскага Земскага Саюза. Саюза Гарадоу. Чырвонага Крыжу, - салдаты папросту не мелі магчымасці свабодна абмеркаваць сітуацыю, падзяліцца ўражаннямі і г.д., пакуль гэта не будзе дазволена зверху. Па сутнасці, за час вайны на Беларусі усталявауся жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым, які выяуляу сябе праз забарону рознага кшталту дзейнасці, апазіцыйнай ураду, праз забарону забастовак на прадпрыемствах, маючых дачыненне да абароны. Без ведама паліцэйскіх улад не дазваляліся публічныя мерапрыемствы, нават вяселлі. Яўрэі, што складалі большую частку гарадскога і местачковага насельніцтва, былі тэрарызаваны адносінамі да іх з боку ўлад як да патэнцыяльных германскіх агентаў. Не выпадкова, што шпіёнаманія была адной з характэрных рыс тагачаснай рэчаіснасці: перапіска па пошце на нямецкай і яўрэйскай мовах каралася штрафамі або турэмным зняволеннем. Вольнае перасяленне ў гарады і з гарадоў знаходзілася пад пільным наглядам паліцыі і контрразведкі. Адзін "пільны" віцебскі газетчык аднойчы ўбачыу шпіёнау нават у кітайцах, якіх лёс у пошуках працы закінуў у наш край.

Не ў лепшым становішчы знаходзіліся франтавікі і гарнізонныя вайскоўцы, палачная дысцыпліна якіх узмацнялася законамі ваеннага часу. Натуральна, што большасць арыштаваных, што знаходзіліся ў губернскіх і павятовых турмах, складалі "ніжнія чыны".

На пачатку сакавіка грамадска-палітычнае жыццё ў краі не вызначалася нейкімі асаблівасцямі. 1 сакавіка паўсюдна ў храмах была адслужана паніхіда ў памяць аб "убиенном" Аляксандры II. У той самы дзень з'явіўся загад галоунага начальніка Мінскай ваеннай акругі генерала Рауша фон Траўбенберга аб узмацненні дапамогі фронту. У ім пакуль ні словам не прыгадвалася аб нейкіх непарадках у сталіцы. Вядома аб іх ужо было вузкаму колу штабных работнікаў Стаўкі ў Магілёве. Паводле слоу начальніка тамтэйшай службы сувязі падпалкоўніка Сяргееускага, пасля ад'езду цара Мікалая II 28 лютага на Царскае сяло сімпатыі генералітэта былі ўжо не на яго баку. Вышэйшае ваеннае камандаванне Расіі ў гэтых умовах было найперш заклапочана захаваннем баяздольнасці яе узброеных сіл і прадухіленнем іх уцягвання ў "палітыку".

Пазіцыя галоўнакамандуючага Заходняга фронту генерала Эверта не адрознівалася ад агульнага пункту гледжання. Каб дасягнуць пастауленых мэт, паводле яго загадаў быў узмоцнены кантроль за паведамленнямі з Петраграда: найперш не дапускалася інфармацыя аб крывавых сутыкненнях салдатаў і афіцэрау. аб расправах з гарадавымі і жандарамі. аб падпалах дзяржауных устаноў і інш. Генерал асабіста аддаў загад аб знішчэнні тэлеграмы камісара Часовага камітэта Дзяржаўнай думы, у якой А.Бублікау паведамляу чыгуначнаму начальству аб адхіленні царскага урада. Тым не

менш, гэта тэлеграма 2 сакавіка ўсё ж з'явілася ў друку на старонках "Вестника Комитета Западного фронта Всероссийского Земского Союза" разам з адозвай старшыні названай арганізацыі В.Вырубава з заклікам аб захаванні спакою і узмацненні дапамогі фронту.

Першыя 2-3 дні сакавіка ў Беларусі не з'яуляліся сталічныя газеты, узмацняючы тым самым грамадскі інтарэс і абывацельскую трывогу да падзей. Поўную інфармацыю мелі толькі частка вышэйшага камандавання, губернскія чыноўнікі і управы буйнейшых гарадоў, ды і то у выглядзе тэлеграм М.Радзянкі. Кожны населены пункт па-свойму пачынаў рэагаваць на падзеі, і выяўлялася гэта найперш не у дэманстрацыях і мітынгах, як гэта было прынята раней лічыць, а у стварэнні часовых грамадскіх камітэтаў дзеля захавання парадку, забеспячэння харчаваннем насельніцтва і вырашэння іншых злабадзённых праблем. Апора ў гэтым пытанні толькі на вайсковую сілу не магла задаволіць ні камандзіраў, ні насельніцтва, якое ніколі не адчувала у вайскоўцах сваіх абаронцаў. Ва умовах блізкага фронту уз'яднанне усіх грамадскіх сіл у мэтах самаахoвы і захавання баяздольнасці войска стала непасрэдным клопатам вышэйшага ваеннага камандавання і начальнікаў мясцовых гарнізонаў. Так, з удзелам начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага генерала Аляксеева, генерала Эверта, начальніка Дзвінскай ваеннай акругі генерала Зуева, начальнікаў гарнізонаў генералаў Клачэнкі, Максімовіча-Раманава, Градзіцкага і інш. адпаведна у Магілёве, Мінску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску, Оршы адбылося ўтварэнне Камітэтаў грамадскай бяспекі.

Першы такі самадзейны орган - Камітэт грамадскай бяспекі і дабрачыннасці быў створаны 3 сакавіка у Гомелі. Увечары таго ж дня пачаў фарміраванне мінскі Камітэт грамадскай бяспекі. 4 сакавіка пачаў дзейнічаць магілёўскі Выканаўчы Камітэт. Да ночы таго ж 4 сакавіка сфарміраваўся віцебскі Гарадскі грамадскі камітэт і г.д. Іх утварэнне падштурхнула да арганізацыі улады ў менш значных населеных пунктах і дало магчымасць сумесна з паліцыяй узяць пад ахову важнейшыя ўстановы і пункты губернскіх і павятовых гарадоў, а таксама чыгуначных станцый. У Оршы раззбраенне паліцыі адбылося да утварэння Камітэта грамадскай бяспекі, але без складанасцей. Горшая сітуацыя ўзнікла у Рэчыцы, Веліжы, Люцыне, Гарадоцкім павеце, дзе за адсутнасцю грамадскіх камітэтаў мелі месца анархічныя выступленні салдатаў, галоўным чынам прыбыўшых з Петраграда. Па іх ініцыятыве там грамілися паліцэйскія установы, паліліся архівы, вызваляліся з турмаў зняволеныя і нават рабавалася маёмасць.

Невыпадкова грамадскія камітэты надавалі першаступенны характар арганізацыі аховы парадку. Здаралася, што у першыя дні сакавіка парадак падтрымліваўся не толькі новай міліцыяй, а і вайсковымі патрулямі і нават чынамі паліцыі. У гэтым напрамку лідэрамі камітэтаў кіравалі не палітычныя або класавыя, а толькі дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы. Так, у Бабруйску самі паліцэйскія расклейвалі "Маніфест" аб адрачэнні цара. У Мінску у арганізацыі гарадской міліцыі браў удзел і паліцмайстар Лебяда. Віцебскі гарадскі камітэт звярнуўся да кіраўнікоў паліцыі аб супрацоўніцтве у галіне аховы парадку і гарантаваў ім асабістую недатыкальнасць. У Магілёве паліцыя і гарадавыя знаходзіліся на сваіх месцах да 7 сакавіка.

Дадатковым сродкам у захаванні грамадскага парадку сталі Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, першыя з якіх пачалі утварацца у Гомелі, Мінску, Віцебску, Оршы, Бабруйску, Полацку, Друі і інш. Як правіла, іх прадстаўнікі з'яўляліся членамі Камітэтаў грамадскай бяспекі і першымі міліцыянерамі.

Арганізатары новай улады на Беларусі імкнуліся да надання сваей дзейнасці выгляду поунай законнасці. Маніфесты аб адрачэнні Мікалая II ад улады і аб адмове Міхаіла Аляксандравіча ад трона былі абвешчаны толькі пасля ўказа манарха аб зацвярджэнні новага кабінета міністрау на чале з князем Львовым. У сваіх зваротах да насельніцтва камандаванне і новыя улады акцэнтавалі увагу на тым, што "хваляванні" у Петраградзе ўжо скончыліся, што іх утаймаванне ўзяла на сябе Дзяржауная дума. Нават "высачайшыя маніфесты" былога манарха і прэтэндэнта на трон заставаліся без каментарыяў, як быццам гэта было звычайнай з'явай.

Першымі, хто выказаў свае адносіны да новага урада, былі ваенныя ўлады: ад галоунакамандуючых да начальнікаў гарнізонау. У тэлеграмах на адрас новага Вярхоўнага галоўнакамандуючага і часовага ураду выказвалася падтрымка і спадзяванне на магчымасць працягу вайны. Ніхто з вышэйшых чыноу адкрыта не выказаўся у падтрымку манархіі, ахвяраваушы ею дзеля магчымасці давесці народ да перамогі ў першай сусветнай вайне.

Трэба зазначыць, што не выявілася шчырых прыхільнікау Раманавых і на Беларусі, нават нягледзячы на тое, што Мікалай II пасля адрачэння вярнууся у Магілёў. Нават вышэйшыя чыны самаўладдзя - губернатары Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў - Друцкі-Сакалінскі, Яўленскі, Хітраво ўжо 4 сакавіка накіравалі на адрас Часовага урада вернападданніцкія тэлеграмы з выказваннем гатоунасці служыць яму.

Тым не менш губернатары і іх намеснікі былі часова адхілены ад займаемых пасад, а вышэйшая у губернях улада паводле загаду Часовага урада перадавалася камісарам, якія дагэтуль з'яўляліся старшынямі губернскіх земскіх управ. Такім чынам, месцы мінскага, магілёўскага і віцебскага губернатараў занялі адпаведна камісары Б.М.Самойленка, В.А Судзілоўскі і М.Л.Карташоў. Па рэкамендацыі апошніх Часовым урадам таксама назначаліся павятовыя камісары.

Важную ролю ў сканструяванні губернскіх і павятовых камісарыятау адыгрывала грамадскасць. Яна у прыватнасці сачыла за тым, каб характар кіравання камісарау адпавядаў абвешчанай праграме Часовага урада. Натуральна, што неузабаве адбыліся перамены сярод іх: пад уздзеяннем дэмакратычна настроеных колау камісарамі Віцебскай і Магілёўскай губерняў былі назначаны А.А.Валковіч і Ф.Я.Хаментоускі. 21 красавіка камісарам неакупіраванай часткі Віленскай губерні быу дэмакратычна абраны В.С.Балай. У далейшым неаднаразова мяняліся і павятовыя камісары. Часовы ўрад зусім не умешвауся у гэты працэс.

Прыхільнікамі новага ладу неузабаве абвясцілі сябе царкоўныя іерархі, заклікаючы да таго ж сваіх падначаленых і прыхажан.

Тыя, хто яшчэ пры цары выклікау незадавальненне жахыроў або салдатау, мусіў заявіць аб сваей далейшай дзейнасці, або адыйсці ад спраў. Так, начальнік магілёускага жандарскага упраўлення палкоунік Яленскі лічыў карыснай сваю службу ў новых умовах, загадаушы 4 сакавіка сваім памочнікам спыніць палітычны вышук і адначасова працягваць "высвятленне агітатарау і падпольнага руху супраць вайны".

Адносіны ўсіх сласу насельніцтва і салдат да бягучых падзей, мясцовых і сталічных, выяуляліся ў залежнасці ад ступені інфармаванасці, наяунасці дэмакратычных сіл, дзейнасці вайсковых і цывільных улад. Як правіла, першыя выступленні на вуліцах адбыліся пасля абвяшчэння славутых маніфестаў. Але і гэтыя выпадковыя неарганізаваныя маніфестацыі выклікалі незадавальненне і непакой новых улад. Так, у Мінску 4 сакавіка грамадзянскі камендант Б.М.Самойленка асабіста прасіў маніфестантаў разысціся і захоуваць спакой. У Гомелі першыя выступленні салдат адбы-

лiся 3 сакавіка, але яны праходзілі арганізавана, у калонах на чале з камандзірамі. У Бабруйску мясцовыя жыхары адчувалі пэўную трывогу з прычыны магчымасці пагромаў і не праводзілі мітынгаў да афіцыйнага дазволу.

Іншая справа, калі святкаванне перамогі над царызмам праводзілася арганізавана. Сапраўды народныя маніфестацыі адбыліся ва ўсіх буйных і нават у дробных населеных пунктах, пачынаючы з 5 сакавіка (у Магілеве) і ажно да 3 красавіка (у Дукоры, Ігуменскага павета). Лозунгамі маніфестантаў былі "Няхай жыве Свабода", "Няхай жыве дэмакратычная рэспубліка", "Няхай жыве Устаноўчы сход" і інш. Людзі аддавалі даніну павагі тым, хто пацярпеў ад царызму, хто не дажыў да тых дзён. У цэнтры ўвагі апынулася армія. У святле бягучых падзей яна выглядала як сіла, разбурыўшая самаўладдзе. Да сярэдзіны сакавіка армія прыняла прысягу на вернасць Часоваму ўраду. Здавалася, што задача абароны новага ладу вырашана канчаткова, бо лічылася, што асноўным яго ворагам з'яўлялася аўстра-германскае войска.

Пасля абвяшчэння Часовым урадам праграмы сваёй дзейнасці на перыяд да склікання Устаноўчага сходу грамадска-палітычнае жыццё Беларусі, як і ўсёй Расійскай імперыі, карэнным чынам мянялася. Як вядома, у ёй абвяшчалася палітычная амністыя, гарантаваліся дэмакратычныя свабоды і многае іншае. Самай масавай і актыўнай сілай у гэтым жыцці зрабіліся найперш салдаты, якія атрымалі роўныя з грамадзянамі правы, а таксама рабочыя, чыноўнікі, інтэлігенты і інш. Неўзабаве абвешчаная праграма пачала здзяйсняцца. Паводле распараджэння міністра юстыцыі А.Ф.Керанскага паўсюдна вызваляліся ўсе палітычныя зняволеныя. І было гэта зроблена не сіламі маніфестантаў або "рэвалюцыйных салдатаў", а паводле ўзгаднення з новымі мясцовымі ўладамі. На палягшэнне сваёй долі спадзяваліся ўсе астатнія арыштаваныя, якія ў пэўным сэнсе адчувалі сябе ахвярамі царскага рэжыму. Так, у Мінску 8 сакавіка некалькі сотзень зняволеных вырваліся з губернскай турмы і прайшлі па галоўных вуліцах з воклічамі "Няхай жыве Свабода". Толькі ўгаворамі Б.М.Самойленкі, з дапамогай міліцыі і патрулёў удалося вярнуць іх на месца. У Віцебску самі ўлады памылкова выпусцілі на волю некалькі сотзень крымінальных, а пасля безвынікова заклікалі дапамагчы ў іх вяртанні. З цягам часу асобнай катэгорыі зняволеных прадастаўлялася магчымасць выйсці на волю з умовай службы на фронце.

На пачатковым этапе развіцця рэвалюцыі на Беларусі назіралася шчыльнае супрацоўніцтва ўсіх пластоў насельніцтва і салдат у Саветах, уладных структурах, рознага кшталту грамадскіх арганізацыях. Як правіла, нават буйнейшыя рабочыя партыі - Бунд і сацыял-дэмакраты знаходзіліся ў сумесных Аб'яднаных арганізацыях. Для амаль усіх пластоў насельніцтва і салдат з'явіўся магутны стымул абараняць новы лад, падтрымліваць новы ўрад, які акрэсліў перад імі перспектывы будучага грамадства - прававой дэмакратычнай дзяржавы. Нідзе з нацыянальных ускраін Расійскай імперыі не адчувалася гэта так востра, як на Беларусі, разрэзанай фронтам, разбуранай вайной, знявечанай духоўна і маральна.

Перакананне арміі і насельніцтва змагацца да ганаровага міру, арганізацыя ўлады, давер грамадскасці Часоваму ўраду патрабавалі ад апошняга карэнных палітычных і сацыяльных рэформаў. Да гэтага часу меліся неблагія перадумовы. Грамадская думка ў рабочым і сялянскім пытаннях поўнасцю стаяла на баку працоўных. Ваенны міністр Гучкоў даў дазвол на 8-гадзінны рабочы дзень на прадпрыемствах абароннага значэння. Неўзабаве патрабаванне такога рабочага дня стала асноўным на прыватных прадпрыемствах.

З канца сакавіка пачалася падрыхтоўка зямельнай рэформы. Да гэтага часу на Беларусі амаль не было захопаў памешчыцкай маёмасці.

Цэнтрам беларускага руху стаў Мінск. Ужо 6 сакавіка тут адбыўся мітынг, які вёўся на беларускай мове. 12 сакавіка адбыўся "Дзень беларускага значка" з мэтаю прапаганды беларускасці і збору сродкаў. Сябры БСГ і БНК ускладалі шчырыя спадзяванні на набыццё нацыянальнай аўтаноміі ў складзе Расійскай федэратыўнай рэспублікі.

Такім чынам, Лютаўская рэвалюцыя прынесла на Беларусь не толькі вызваленне ад царскага прыгнёту, не толькі палітычныя свабоды, а і магчымасць для яе жыхароў адчуць сваю нацыянальную годнасць, задаволіць свае духоўныя і культурныя патрэбы.

Не трэба перабольшаваць ролі беларускага народа ў барацьбе супраць царызму. Рабочыя і салдаты Петраграда, знішчыўшыя самаўладдзе, заваявалі для ўсей краіны, у тым ліку і для Беларусі, рэальныя правы "людзьмі звацца" і найперш для асноўнай масы насельніцтва - працоўных, а таксама для вайскоўцаў. На Беларусі таксама не знайшлося сіл, якія б супрацьстаялі пераўтварэнням. Ліквідацыя старой сістэмы улады і арганізацыя новай не запатрабавалі выкарыстання "рэвалюцыйных" мер. На працягу сакавіка-красавіка адбывалася інтэнсіўная дэмакратызацыя ўсіх бакоў жыццядзейнасці края: адміністрацыйнай, эканамічнай, палітычнай, ваеннай і інш.

Але з'явіліся і першыя сімптомы парушэння ўяўнага адзінства грамадства. Пераканаўшы народ у мэтазгоднасці далейшай вайны, Часовы ўрад не вызначыў крокаў на шляхах да доўгачаканага міру. Салдаты, у іх ліку і акопнікі Заходняга фронту, усё часцей супрацьпастаўлялі свае камітэты загадам камандзіраў. У шэрагу месцаў беларускія сяляне імкнуліся вырашыць свае гаспадарчыя праблемы за кошт памешчыкаў. Узнікненне шматлікіх партыйных, грамадскіх, нацыянальных арганізацый не спрыяла умацаванню дэмакратычных сіл. У час, калі эйфарыя перамогі над царызмам прайшла, кожная з гэтых сіл па-свойму бачыла вырашэнне наспелых праблем. Пры гэтым, пераважная іх большасць кіравалася не мясцовымі, краевымі, а агульнарасійскімі інтарэсамі.

А.Г.Багдановіч

## ПРАБЛЕМА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ НА І УСЕБЕЛАРУСКІМ З'ЕЗДЗЕ (СНЕЖАНЬ 1917 ГОДА)

Па насычанасці падзеямі 1917 год займае асаблівае месца ў гісторыі барацьбы беларускага народа за нацыянальнае вызваленне, палітычную і эканамічную самастойнасць. Менавіта у гэты час на першае месца выходзіць пытанне дзяржаўнага самавызначэння беларускай нацыі, больш акрэсленыя выгляд набываюць уяўленні аб формах і змесце нацыянальнай дзяржаўнасці, прадпрымаюцца спробы яе дасягнення.

Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 года падарвалі асновы магутнай Расійскай імперыі. Шматлікія народы, якія уваходзілі у яе склад, пачынаюць шукаць шлях да свайго нацыянальнага самавызначэння.

Распад царскай імперыі прыкметна дынамізуе беларускі грамадска-палітычны рух. Нацыянальная ідэя актывізуе свядомасць многіх беларусаў - вайскоўцаў, сялян, рабочых, уцекачоў. Носьбітам гэтай ідэі становіцца нацыянальная інтэлігенцыя, аб'яднаная у палітычных партыях і грамадскіх арганізацыях. Разняволены ад Петраградскага цэнтралізму беларускі народ апынуўся перад праблемай выбару свайго на-